# 25 жніўня стартуе Рэспубліканская акцыя "Увага - дзеці!"

Прафілактычная акцыя закліканая прыцягнуць усеагульную ўвагу да праблемы забеспячэння бяспекі дзяцей на дарозе, павысіць узровень адказнасці бацькоў і вадзіцеляў.

2021/08/27 пройдзе Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху пад дэвізам «Урокі бяспекі вывучайце з дзяцінства», прысвечаны прафілактыцы дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму перад пачаткам навучальнага года, а таксама павышэння ўзроўню адказнасці кіроўцаў.

Падчас мерапрыемстваў плануецца правядзенне рэйдаў супрацоўнікамі органаў унутраных спраў па спыненні парушэнняў Правілаў дарожнага руху, у прыватнасці - кантролю за выкананнем правілаў праезду пешаходных пераходаў, хуткасных рэжымаў руху, а таксама перавозкі пасажыраў-дзяцей у легкавых аўтамабілях.

Нагадваем, што ў перыяд правядзення Міністэрствам унутраных спраў рэспубліканскіх спецыяльных комплексных мерапрыемстваў па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху, прадугледжваецца рух транспартных сродкаў у светлы час сутак з уключанымі блізкім святлом фар або дзённымі хадавымі агнямі (пры іх наяўнасці).

Беражыце дзяцей і памятайце, што яны заўсёды глядзяць на вас. Не баяцца, не ведаюць небяспекі. Проста паўтараюць. Будзьце годным прыкладам свайму дзіцяці.

Інфармацыйныя матэрыялы